# СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя навекі пахавала памешчыкаў, капіталістаў, кулакоў, царскіх чыноўнікаў. Пры дапамозе вялікага рускага народа, пад кіраўніцтвам слаўнай комуністычнай партыі, беларускі народ упершыню ў гісторыі прышоў да поўнага свайго нацыянальнага вызвалення, пабудаваў сваю соцыялістычную дзяржаву — неадрыўную частку вялікага Совецкага Саюза.

Совецкая Беларусь з былой царскай калоніі ператварылася ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку з буйнай прамысловасцю і калектывізаванай, машынізаванай сельскай гаспадаркай.

Совецкая ўлада разбіла старое ўяўленне аб Беларусі, як аб краіне беднай прыроднымі багаццямі. Пры совецкай уладзе ў нетрах Беларусі выяўлены розныя віды сыравіны, якія могуць саслужыць добрую службу соцыялістычнаму будаўніцтву: мел, фасфарыты, вапнякі, цэментныя мергелі і т. д. Беларусь багата торфам (да 600 млн. тон). Лясы пакрываюць каля 25 проц. тэрыторыі рэспублікі.

Тэрыторыя Совецкай Беларусі складае каля 126 тысяч кв. кілометраў. Яна падзяляецца на 5 абласцей: Магілеўскую, Віцебскую, Гомельскую, Менскую і Палескую.

—О—

## Н. Я. НАТАЛЕВІЧ


В. а. Старшыні ЦВК БССР, намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.


—О—

цыянальнасці. Акрамя таго, у Беларусі жывуць рускія, яўрэі, палякі і др.

Паўднёвая частка рэспублікі, так званае Палессе, пакрыта велізарнымі балотамі. Тут за годы совецкай улады шырока разгарнуліся асушальныя работы. На асушаных балотах выраслі буйныя соўгасныя і калгасныя гаспадаркі. Асушка балот аздаравіла клімат, глеба стала менш вільготнай, паветра больш сухім.

Беларусь мае добрыя водныя шляхі. Днепр з яго прытокамі — Бярэзінай, Прыпяццю і Сожам — галоўныя водныя артэрыі Беларусі. На поўначы рэспублікі працякае Заходняя Дзвіна.

У 1913 годзе кошт валавой прадукцыі ўсёй прамысловасці на тэрыторыі цяперашняй Совецкай Беларусі (у цэнах 1926—27 г.г.) складаў 89 млн. рублёў. Лік рабочых буйнай прамысловасці не перавышаў тады 26 тысяч. Гэтыя лічбы не ідуць ні ў якое параўнанне з тым, чаго Беларусь дабілася пры

склаў ужо 2 млрд. 100 млн. рублёў — у 23,5 раза больш, чым у 1913 годзе!

Дарэволюцыйная прамысловасць Беларусі насіла пераважна саматужны характар. Асноўныя яе віды — харчовая і лёгкая прамысловасць. За годы совецкай улады ў БССР створаны зусім новыя галіны прамысловасці: апалавая, тарфяная, хімічная, машына-станкабудаўнічая, вытворчасць штучнага шоўку, трыкатажная, швейная і др. Пабудаваны буйныя прадпрыемствы з новай тэхнікай, рэканструяваны і тэхнічна абноўлены існаваўшыя прадпрыемствы.

Ва многа раз вырасла колькасць рабочага класа, узняўся яго матэрыяльны дабрабыт, павысіўся яго культурна-тэхнічны ўзровень.

Здзіўляючыя перамены адбыліся ў беларускай вёсцы. Адышлі ў мінулае брудныя, курныя хаты. Карчма і царква ўступілі месца клубам, школам, бальніцам, яслям. У вёсцы будуюцца добрыя, крытыя чарапіцай і жалезам дамы. Ва многіх раёнах сялянскія хаты асвятляюцца электрычнасцю. Сельская гаспадарка ўсё больш механізуецца.

Згодна даных на першае ліпеня 1937 года, у Беларусі было каля 10 тысяч калгасаў, аб'яднаўшых каля 680 тысяч сялянскіх двароў. Ім на-


Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы